# КАЛЯДНЫЯ МАТЫВЫ: САКРАЛЬНЫ ЗМЕСТ І ТРАДЫЦЫІ СВЯТКАВАННЯ

## Значэнне і роля святочнай культуры беларусаў у фарміраванні духоўных каштоўнасцей школьнікаў



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар

**Еўрапейская святочная культура багатая і разнастайная. Але, бадай, найбольшай казачнай абаяльнасцю, сямейнай утульнасцю, эмацыянальнай насычанасцю вылучаецца святкаванне Раства Хрыстова. У ім адчуваецца таямніца нараджэння надзеі, радасці, шчасця, дабра, ачышчэння чалавека ад спрадвечнага граху. Нездарма ў еўрапейскай літаратуры ўзнік у XIX ст. асобны празаічны жанр – каляднае апавяданне. Зачынальнікам гэтага жанру лічыцца Чарлз Дзікенс. У 1843 г. ён напісаў сваю славутую «Калядную песню ў прозе». Пазней з'явіўся цыкл калядных твораў, аўтарамі якіх сталі Х.-К. Андэрсан, А. Франс, Ж. Леметр, С. Лагерлёф, Л. Андрэеў, М. Гогаль, Ф. Дастаеўскі, У. Караленка, А. Купрын, У. Набокаў, А. Чэхаў. Хвалявалі калядныя матывы і беларускіх майстроў прыгожага пісьменства.**

### Калядныя матывы ў беларускай літаратуры

Ян Баршчэўскі ў кнігу «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» уключыў апавяданні «Куцця», «Вечар перад Новым годам», «Госці ў хаце Завальні», дзе па-майстэрску перадаў фантастычна-святочную атмасферу каляднага вечара. Дайшло да нас таксама апавяданне Марыі Багдановіч, маці Максіма Багдановіча, «Напярэдадні Раства», надрукаванае ў 1893 г. у газеце «Гродненские губернские ведомости». Надзвычай вобразна адлюстраваў калядныя падзеі Якуб Колас (апавяданні «Ігрышча», «Куцця», паэма «Новая зямля»).

**Каляды** (calendae – лацінская назва першага дня кожнага месяца) – народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання ў цыкле каляндарнага года. У традыцыйнай культуры ўсходніх славян яно звязана з таямніцай вытокаў усеагульнага пачатку. Свята гэтае супадала з найважнейшай прыродна-касмічнай падзеяй: заканчэннем зімовага сонцастаяння і паваротам сонца на новы гадавы цыкл. У гадавым коле народных аграрных абрадаў гэта свята займала першае месца. З прыняццем хрысціянства Каляды былі прымеркаваны да святкаванняў Раства і Вадохрышча.



У Беларусі рытуал святкавання нараджэння Ісуса Хрыста цесна звязаны з народнай каляндарнай традыцыяй. Сакральнасць гэтай падзеі абумоўлена ў вялікай ступені чаканнем надыходу цяпла, надзеяй на добры ўраджай у новым гаспадарчым годзе, чаму і павінны спрыяць пэўныя магічныя дзеянні. Якуб Колас у сваіх мастацкіх творах надзвычай ярка перадаваў пачуцці людзей падчас гэтага цудоўнага свята. Дзеці і дарослыя з нецярплівасцю чакаюць яго. Увага дзяцей усё больш канцэнтруецца не на вучобе, а на падрыхтоўчых святочных клопатах: «І думка іх не тым занята, / Усё болей ходзіць каля свята. / І міла гэта іх чаканне!»[4, с. 199].

Выдатна перадае перадкалядную эмацыянальную атмасферу і Марыя Багдановіч. У апавяданні «Напярэдадні Раства» аўтарка псіхалагічна тонка апісвае ўстрывожанасць дзяцей, якія баяцца, што Сын Божы можа і не прыйсці да іх. «Мама, – працягвае распытваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міхась, – ведаеш, чаго я баюся? – што Хрыстос не паспее ўсіх абысці. А можа, ён забудзе, што каму трэба падарыць? Мне б так хацелася мецъ коніка!» [1, с. 14]. Хворая маці супакойвае дзяцей, кажучы: «Вось і сёння, калі ты і брацік засняце і на дварэ будзе зусім цёмна, сыдзе на зямлю Хрыстос і пойдзе з горада ў горад, не абміне ні ўбогай хацінкі, ні багатага дома, пабывае ўсюды, дзе ёсць дзеці, і кожны з іх, прачнуўшыся на наступны дзень, знойдзе каля свайго ложка, што хацеў» [1, с. 14].

Цікавыя, маляўнічыя рытуальна-абрадавыя дзеянні дэталёва апісваюць у сваіх творах Ян Баршчэўскі і Якуб Колас. Так, Колас у кантэкст каляднага абрадавага дзейства ўключае надзвычай шырокае кола прадметаў. Вось, напрыклад, радкі, прысвечаныя ўпрыгожанай ёлцы: «Ялінка ў хаце так прыгожа! / І колькі радасці і ўцехі! / На ёй валоскія арэхі, /А з пазалочанай паперкі / Глядзяць панадныя цукеркі; / І больш на ёй няма нічога, / Ды хіба дзецям трэба многа? /Даволі з іх і той прынады – / Яны давольны, яны рады» [4, с. 203].

Для каляднага свята характэрны тры абрадавыя вячэры (куцці): посная (вялікая) ладзіцца перад першым святочным днём; багатая (тоўстая, шчодрая) з мяснымі стравамі – у вечар перад Новым годам; посная (галодная, вадзяная) – перад Вадохрышчам. Стравы з'яўляюцца своеасаблівым сімвалічным кодам у структуры свята. Святкаванне Каляд пачынаецца з вялікай куцці. Куцця – гэта рытуальная страва, якая ўяўляла сабой ячменную кашу з мёдам. Вячэра пачыналася са з'яўленнем на небе першай зоркі. Ян Баршчэўскі дэталёва перадае гэты рытуальна-абрадавы момант: «Паказалася першая зорка на небе; пасярод паставілі доўгі стол, заслалі яго сенам і пакрылі белым абрусам. Посную ежу з мёдам і найлепшую рыбу падалі на стол. Завальня ламаў аплатку з панам Марагоўскім, а пасля па чарзе – з кожным госцем» [2, с. 168–169]. На куццю было прынята запрашаць гасцей, імі звычайна былі бліжэйшыя суседзі. За вячэрай Завальня распавядаў гасцям, «...як колісь князь Агінскі, добры і ласкавы пан, запрашаў на гэты вечар да сябе ўсіх суседзяў, не зважаючы, ці ён бедны, ці багаты, абы толькі шляхціц і прыстойны чалавек» [2, с. 169]. Па традыцыі і сам шляхціц Завальня на святочную вячэру запрасіў з жонкамі і дзецьмі суседзяў, што жылі ля возера Нешчарда.

З выключным лірызмам паказвае сімвалічнае значэнне куцці Якуб Колас: «Куцці гаршчок ужо ў калена / Стаяў на лаве, чакаў сена, / І вось цяпер гаршчок з куццёю, / У пачэсны кут, на свой прастол, / Стаўляўся з гонарам на стол» [4, с. 202]. Акрамя куцці на святочны стол ставілі «акунькі, мянькі і плоткі», квас, верашчаку, блінчыкі на маку, ламанцы-праснакі, кампоты, «кісель з мядоваю сытой». Калядная вячэра выткана Якубам Коласам з сапраўдных вясёлкавых слоў-вобразаў: «І вось вячэра зачалася! / Спыніцца мушу я на квасе: / Ён колер меў чырванаваты; / Тут быў таран, мянёк пузаты, / Шчупак, лінок, акунь, карась, / Кялбок і ялец, плотка, язь» [4, с. 205].

Абрадавая ежа выступае ў пісьменнікаў пэўным ключом да разумення сутнасці святочных падзей. Колас і Баршчэўскі адносяць да абрадавых страў зерне, рыбу, мак, мёд, бліны, кісель, грыбы, кашу, гарэлку, квас і інш. Абавязковым на калядным стале лічылася свежае мяса япрука: «І кожны дворык, кожна хата, /Хоць і жыве не так багата, /Але калядаў у адзнаку /Заколе хоць бы падсвінаку» [4, с. 200].

Рытуальнае значэнне на Каляды надаюць беларусы сену. Яго кладуць на святочны стол як напамінак аб тым, што Ісус Хрыстос нарадзіўся ў яслях. «На стол растрэсваюць мураг – / На сене колісь быў сын-Бог – / І роўным пластам расцілаюць,/ Сянцо абрусам закрываюць» [4, с. 204]. Пасля калядна́й вячэры сена са стала раніцой аддавалі свойскай жывёле, каб тая была здаровая і добра пладзілася. З дапамогай рытуальнага сена людзі імкнуліся атрымаць сімвалічную інфармацыю аб будучым ураджаі: «На першы дзень святых калядак – / Такі ўжо стары парадак— / Збіралі сена са стала, / Кармілі ім каня, вала / І ўсіх жывёлін, хоць па жмені. /А на стале, у драбнюткім сене — / Здавен-даўно вялося й гэта / Уважна зернятак шукалі / І па тых зернятках гадалі, /Які зародзіць хлеб на лета» [4, с. 205]. Госці Завальні таксама, седзячы за святочным сталом, «падсоўвалі руку пад абрус, выбіралі наўдачу даўжэйшую сухую сцяблінку, паказвалі адно аднаму, загадвалі, ці высокі будзе наступнаю вясною расці на полі лён, а паненкам прадказвалі хуткае замужжа. Шукалі пад сенам зярнятак жыта, пшаніцы ці іншага збожжа, бо яно, выпадкам знойдзенае ў гэты вечар пад сенам, вешчавала вялікі ўраджай» [2, с. 169]. Беларусы па надвор'і, якое стаяла на куццю, вызначалі і іншыя з'явы наступнага года: «Снег – на куццю – грыбы на лета, /Такая матчына прыкмета, / А сцежкі чорны – ягад многа; / Ну і за гэта хвала Богу» [4, с. 202].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

## Выразныя сродкі народнага мастацтва

Надзвычай вялікую ўвагу надавалі беларусы ыбару прасторы, у якой ладзілася свята. Месам яго правядзення станавіліся дом, вуліца, арчма, якія адпаведным чынам пераўтвараліся, абывалі ўрачысты выгляд: «І ўсе прыбраліся памыліся, / Міхась з Антосям падгаліліся/ І арасчэсвалі чупрыны / – Ну, засцілайце стол, ıужчыны! – /І стол той гуртам прыбіраюць, / Іастольнік белы падымаюць» [4, с. 204]. Святочная прастора паказана Коласам як сфера эстэтычнага. Сузіранне яе шматколернасці, арманічнай прыгажосці не толькі выклікае ў ерояў паэмы «Новая зямля» захапленне, святое рапятанне сэрца, але і прыносіць ім заспакаене, дае жыватворныя сілы, надзеі на лепшую будучыню: «У хаце добры лад і згода, / Як патраye і прыгода, / Паважнасць вечара святога – / Іе ўчуеш слова ты благога» [4, с. 203–204].

Госці шляхціца Завальні пасля святочнай вячэры выходзілі на вуліцу і, «гледзячы на яснае, зорным сяйвом неба і на вогненныя дарогі ıетэарытаў, выказвалі надзеі на добрую вясну на багаты збор садавіны і гародніны ўвосень» 2, с. 169].

У святочныя дні спыняліся ўсе гаспадарчыя аботы. Усё неабходнае для жыццядзейнасці арыхтоўвалі загаддзя, каб не працаваць у вяточныя дні: «І дроў на свята накалолі, / 'расянкі загадзя натрэслі, / Сянца пахучага рынеслі» [4, с. 202].

Семантызацыя артэфактаў свята ствараецца жо ў працэсе падрыхтоўкі да яго, а не толькі святочных рытуалах і абрадах. Традыцыйная святочная культура беларусаў патрабавала ктыўнага ўдзелу ў свяце ўсіх суб'ектаў соцыуму. 'аму выключна ўсе коласаўскія літаратурныя ерої ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да зімовага вята. Гэта тлумачыцца тым, што сродкамі святочнага дзейства ў памяці людзей узнаўляюцца ышэйшыя каштоўнасці быцця, з якімі звязаны энс існавання чалавека. Так, дзядзька Антось і :остусь перад куццёй лавілі для святочнага стаа рыбу: «Міхал – ужо неяк увайшло ў моду / Ў Іясвіж прад святамі штогоду / Вазіў для замкаых паноў / Грыбы, і рыбу, і зайцоў» [4, с. 202]. :лопатам Ганны (жонкі лясніка) было прыгатааць куццю: «А ў маткі ўсё абмеркавана / І ўсё радумана ад рана» [4, с. 203].

Вялікае значэнне ў традыцыйнай святочай культуры надавалася калядным пажаданям. Беларусы шчыра верылі, што святочнае слова валодае асаблівай сілай. З дапамогай слова ў рознай форме (песні, прытчы, казкі, загадкі святочнага пажадання, малітвы і інш.) чалавек кантактаваў з Богам, святымі, памерлымі продкамі, навакольнай прыродай. Якуб Колас выключна ўважліва адбірае моўны матэрыял пры абмалёўцы калядных падзей і характарыстыцы ўдзельнікаў свята. Святочныя пажаданні маюць функцыянальную накіраванасць. Удзельнікі свята жадаюць адзін аднаму здароўя, даўгалецця, не ведаць гора і смутку. Пажаданні напоўнены спадзяваннямі на добры ўраджай, багаты прыплод хатняй жывёлы, прыбытак у гаспадарцы. Так, Міхал і Антось звяртаюцца адзін да аднаго і ўсіх прысутных на святочнай вячэры з запаветнымі пажаданнямі: «– Ну, што ж, Антось, здароў будзь, браце! / Няхай дае Бог лад у хаце, / Дабра, прыбытку прыспрые, / Каб у хляве ды ўсё пладзілась, / Каб жыта ў полі каласілась, / Няхай раяцца добра пчолы, / І самі будзем мы вясёлы; / За год дай божа дачакаць / Здаровым новы год спаткаць» [4, с. 204].

Святкаванне Каляд суправаджалася ігрышчамі, якія зарадзіліся яшчэ ў дахрысціянскі перыяд і працягваюць бытаваць і сёння – у адаптаваных да сучаных умоў формах. Разам з танцавальна-гульнявымі і тэатралізаванымі паказамі яны прымяркоўваліся да найважнейшых перыядаў каляндарнага цыкла, звязаных з сонцастаяннем і раўнадзенствам. Менавіта таму ігрышчы ладзіліся часцей за ўсё зімой, вясной і летам (Каляды, Маслянка, Купалле, Радаўніца і інш.). Прасторай, у якой звычайна моладзь ладзіла ігрышчы, была карчма. Звесткі аб гэтым можна знайсці ў працах беларускіх этнографаў, у паэме Якуба Коласа «Сымон-музыка», у апавяданні «Ігрышча». Так, П. В. Шэйн адзначаў: «На 2-гі дзень Раства Хрыстова, на Новы год <...> на Дзядовую нядзелю і заговіны сяляне нашыя і малыя, і вялікія, старыя <...> ідуць у карчму, дзе ў танцах і гульнях праводзяць ноч» [5, с. 104]. Колас таксама стварыў мастацкі вобраз гэтай святочнай імпрэзы, якая адбывалася ў карчме: «Тут ігрышчы адбываліcь / Перад святамі зімой. / Танцавалі маладыя, / Весяліліся, пілі, / Для іх скокі, гульні тыя / Многа радасці нясли» [4, с. 373].

Найбольш часта ў ігрышчах выкарыстоўваліся такія традыцыйныя абрадава-гульнявыя дзеі, як «Жаніцьба Цярэшкі», карагод-гульня «Яшчур» і інш. Дзеі абапіраліся на карнавальную лексіку з уласцівай ёй логікай адваротнасці. Тэатралізацыя суправаджалася жартоўнымі спаборніцтвамі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

хлопцаў і дзяўчат, дзе была выразна ўвасоблена альтэрнатыва «мужчынскае – жаночае». Дзеі ўключалі шэраг гульнявых этапаў. Усе этапы функцыянальна і тэматычна звязваліся і афармляліся прымеркаванымі да свята песнямі і танцамі. Змест гульнявых песень раскрываўся праз адзінства трох кампанентаў: выразных сродкаў, музыкі і гульнявога дзеяння. Рухі спевакоў таксама звязаны з сюжэтам і ўяўляюць сабой разыгрыванне сітуацый, апісаных у тэксце песні. Калядным песням уласцівы зычлівы гумар, крытычнае супастаўленне з'яў, прадметаў, характарыстыка персанажаў дзеі праз абыгрыванне працоўна-бытавых сітуацый і артыстычнае выяўленне чалавечай натуры. На ігрышчах часта выконваліся песні, у якіх былі ўвасоблены асноўныя сферы жыццядзейнасці чалавека, маральны і псіхалагічны вопыт беларускага этнасу.

Акрамя гуртавых тэатральных паказаў, на ігрышчах выконваліся народныя танцы розных гісторыка-стылявых форм. Распаўсюджанымі на Беларусі былі парна-гуртавыя, парныя і сольныя формы. Яны мелі разнастайную кампазіцыю, устойлівую або імправізацыйную структуру (ад аднаматыўных да шматкаленных). Адметнасць шматкаленных танцаў выразна паказаў Якуб Колас у апавяданні «Ігрышча». Паэт вельмі вобразна апісаў выкананне народнага танца «Каваль» двума мужчынамі: «То адзін, то другі / Плечуком ускіне, / Рукі іх – лук тугі, / І пастава іх нагі / У належным чыне» [3, с. 101]. Колас называе шэраг іншых танцаў, якія моладзь выконвала падчас ігрышчаў: «Тут і вальсы, тут і полькі, / Гоман, жарты, смех і гук» [3, с. 100].

У калядныя святы моладзь ладзіла і маскарадныя паказы. Найбольш распаўсюджанай на Беларусі была тэатралізаваная кампазіцыя «Ваджэнне казы». У названай імпрэзе спалучаліся песня, танец і дыялог. У маскарадзе звычайна ўдзельнічалі 10–15 чалавек. Галоўным персанажам, безумоўна, была «каза», ролю якой выконваў невысокі хлопец, здатны да танцаў і імправізацыі. Яго апраналі ў вывернуты кажух, на галаву нацягвалі маску. Ролю «дзеда», які вадзіў «казу», выконваў высокі хлопец з развітым пачуццём гумару. Ён павінен быў муштраваць казу, падганяць кіем. «Каза» выконвала абрадавы танец: тупала, падскоквала, біла «дзеда» капытамі, бадала рагамі, клалася на падлогу, прыкідвалася памерлай. Дзея суправаджалася народнай песняй, якую выконвалі песельнікі. Песня праслаўляла станоўчыя якасці «казы». Удзельнікі маскараднага паказу спрабавалі ажывіць рагатую, але беспаспяхова. Толькі пасля шчодрых падарункаў ад гаспадара «каза» ажывала. Песельнікі за гэта праслаўлялі яго: выконвалі віншавальную песню з пажаданнем гаспадару добрага ўраджаю.

Падсумоўваючы вышэй сказанае, неабходна адзначыць, што каляднае свята беларусаў насычана рознажанравым народным мастацтвам, у якім адлюстраваны адметнасці беларускай этнапрасторы, беларускага вобразу свету, ментальнасці, нацыянальнага характару, псіхікі і ладу мыслення народа. У духоўнай спадчыне нашага народа назапашаны самабытныя элементы каляднага свята, якія ў адаптаваных формах могуць з поспехам выкарыстоўвацца і сёння. Шматколерныя карцінкі святочных імпрэз рассыпаны ў тэкстах мастацкіх твораў беларускіх пісьменнікаў. Спадчына Якуба Коласа, Яна Баршчэўскага і іншых – багатая скарбонка традыцый святочнай культуры беларусаў. Можна з яе чэрпаць поўнай жменяй звесткі аб абрадах, рытуалах, дзеях, стравах і іншых святочных артэфактах.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Багдановіч, М.** Напярэдадні Раства / М. Багдановіч // Роднае слова. – 2010. – № 12. – С. 14–15.
2. **Баршчэўскі, Я.** Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі; уклад., пер. з польск. мовы і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 383 с.
3. **Колас, Я.** Збор. твораў: у 14 т. Т. 3: Апавяданні вершам, вершы, вершаваныя казкі, паэмы для дзяцей і народныя казкі ў апрацоўцы Я. Коласа / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1973.– 408 с.
4. **Колас, Я.** Новая зямля: паэма / Я. Колас. — Мінск: БФК, 2002. – 904 с.
5. **Шейн, П. В.** Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. – СПб., 1902. – Т. III.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ